# Інструкцыя для Windows

1. Спампуйце апошнюю версію нашай зборкі і ўсталюйце яе.
    - https://netflix.by-reservation.com/kodi/kodi_bel_latest.exe
2. На вашым працоўным стале з’явіцца ярлычок — пстрыкніце на яго, каб запусціць плэер. У нашах зборцы ўсё загадзя наладжана (зададзены патрэбныя налады і параметры, усталяваны патрэбныя дапаўненні, выбрана беларуская мова інтэрфэйсу).




3. Выберыце «*Дапаўненні*» (*Addons*), а потым *Netflix BY*




4. Увядзіце свае ўліковыя даныя (лагін і пароль), пад якімі вы зарэгістраваліся на відэасэрвісе Netflix, а далей выберыце свой профіль у Netflix.
5. Выберыце пункт *Search* і ўвядзіце ў полі пошуку назву жаданага фільма — у нашым выпадку гэта будзе «Witcher» (без двукоссяў). Далей выбірайце сезон і патрэбную серыю і атрымлівайце асалоду ад прагляду.




6. Пры самым першым праглядзе Kodi Bel запрапануе ўсталяваць вам дапаўненне Widevine CDM — пагадзіцеся, націснуўшы *Install Widevine*, а потым на *I accept*.




7. Карысныя гарачыя клавішы ***для* *Windows***, якія могуць дапамагчы пры праглядзе:

- T – уключыць/адключыць паказ субцітраў;\
- L — пераключыцца на наступныя субцітры;
- ; (Ж) — пераключыцца на наступную аўдыядарожку.

Заўвага: гэтыя гарачыя клавішы працуюць толькі калі на экране не паказваецца палоска пракруткі відэа і кнопкі навігацыі (перамотка, паўза і падобныя).

8. Пры праглядзе ***для Windows*** будуць адразу перадвызначана выбірацца беларускія субцітры і агучка. У выпадку з іншымі аперацыйнымі сістэмамі (***macOS,* *Linux,* *Android***) іх трэба будзе выбіраць самастойна:, націснуўшы падчас прайгравання відэа на шасцяронку ў ніжнім правым куце экрана і далей выбраўшы:
*для аўдыя:* націсніце на значок шасцяронкі ў ніжнім правым куце экрана > Audio Settings > Audio stream і выберыце жаданую аўдыядарожку




*для субцітраў:* націсніце на значок з воблачкам-дыялогам ў ніжнім правым куце экран. Пераключыце параметр Enable subtitles у значэнне Укл. і ў Subtitle выберыце жаданыя субцітры.

